Преступники, как правило, устанавливают связь с теми лицами, которые могут оказать им помощь в приобретении материалов, необходимых для подделки денег, изготовления приспособлений, штампов, клише и т. д. В некоторых случаях они стремятся подобрать сбытчиков фальшивых купюр. При отработке версии о том, что фальшивомонетчики (сбытчики) являются приезжими, проводятся мероприятия по проверке лиц, проживающих в гостиницах, общежитиях, домах отдыха, санаториях, в комнатах отдыха на вокзалах.

В жилом секторе выявляют граждан, сдающих приезжим принадлежащие им жилые помещения для временного проживания, а также устанавливают лиц, временно проживающих или проживавших там в период сбыта фальшивых денег, и осуществляют их проверку.

Имея дело с лицами, склонными к совершению фальшивомонетничества, следует учитывать и то обстоятельство, что для сбыта фальшивых купюр они часто выезжают в различные города не только нашей республики, но и стран СНГ, используя воздушный, железнодорожный, водный и автомобильный транспорт. Суть в том, что полиграфический способ позволяет изготовить большое количество знаков, и преступникам в целях безопасности их сбыта необходимо много перемещаться, приезжать в места с высоким уровнем миграции населения, где преобладают кратковременные контакты граждан. Как правило, маршруты передвижения и приемы сбыта поддельных денег тщательно продумываются, при этом разрабатывается и легенда, объясняющая в случае задержания наличие у них фальшивых денег.

При обнаружении фальшивок, например, в билетных кассах Аэрофлота, необходимо по копиям билетов установить приобретавших их лиц. В других случаях следует проанализировать прибытие и отправление поездов, самолетов с целью установления наиболее вероятных маршрутов, которыми могли прибыть или убыть сбытчики. Если версия подтверждается соответствующей информацией, то посылаются ориентировки в органы внутренних дел на транспорте места назначения для организации задержания преступников при последующих попытках сбыть фальшивки. Следует в обязательном порядке ориентировать и органы внутренних дел, которые обслуживают территории, прилегающие к этим местам сбыта.

В заключении отметим, что для проведения следственных действий в отношении фальшивомонетчиков и установления общности происхождения денежных билетов (по способу и технологии изготовления) большое значение имеет картотека поддельных денег, которая организована в Государственном комитете судебных экспертиз Республики Беларусь.

**УДК 343.98**

***П. А. Капіца***
(*Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Мінск*)

# АБ СТРУКТУРЫ КРЫМІНАЛІСТЫЧНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ РАСКРАДАННЯЎ ШЛЯХАМ ЗЛОЎЖЫВАННЯ СЛУЖБОВЫМІ ПАЎНАМОЦТВАМІ, УЧЫНЕНЫХ ПАД ВЫГЛЯДАМ РАСПРАЦОЎКІ І ЎДАСКАНАЛЕННЯ ПРАГРАМНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ

*У публікацыі вылучаны і сцісла апісаны элементы структуры крыміналістычнай характарыстыкі раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, учыненых пад выглядам распрацоўкі і ўдасканалення праграмнага забеспячэння. Актуальнасць тэмы вызначаецца грамадскай небяспечнасцю і высокай латэнтнасцю злачыннасці віду, які разглядаецца. Навізна заключаецца ў адсутнасці грунтоўных навуковых даследаванняў па выбранай праблематыцы.*



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

На распрацоўку і ўдасканаленне праграмнага забеспячэння (далей – РПЗ) у Беларусі выдаткуюцца значныя аб'ёмы грашовых сродкаў, у тым ліку бюджэтных. Імі могуць завалодаць недобрасумленныя выканаўцы па дагаворах аб стварэнні камп'ютарных праграм. Пры ўчыненні злачынстваў такога кшталту праграмнае забеспячэнне не ствараецца ўвогуле або заказчыку прадстаўляюцца састарэлыя праграмы ці софт, які не працуе. Калі ў злачынную дзейнасць уцягнуты службовыя асобы арганізацый-заказчыкаў, то магчыма сцвярджаць аб учыненні раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі.

Для паспяховага процідзеяння гэтым злачынствам неабходна вылучыць іх крыміналістычна значныя прыкметы, якія дазволяць прапанаваць рэкамендацыі па выяўленні, збіранні і ацэнцы доказаў. Такія прыкметы злачынстваў навукоўцамі, як правіла, фармулююцца ў выглядзе тэарытычных інфармацыйных мадэляў – крыміналістычных характарыстык злачынстваў.

Структура крыміналістычнай характарыстыкі можа ўключаць шэраг элементаў (звестак розных тыпаў). Найбольш поўны іх пералік даў У.Ф. Ермаловіч. Ён вылучыў звесткі аб: аб'екце і прадмеце злачынства; спосабе ўчынення злачынства; спосабе ўтойвання злачынства, які знаходзіцца за межамі спосабу ўчыненння злачынства; спосабе ўхілення ад крымінальнай адказнасці і пакарання; месцы і часе ўчынення, утойвання злачынства і ўхілення злачынца ад крымінальнай адказнасці і пакарання; прыладах і сродках, якія выкарыстоўваюцца пры ўчыненні, утойванні злачынства і ўхіленні злачынца ад крымінальнай адказнасці і пакарання; абстаноўцы злачынства (да, у час і пасля ўчынення злачынства); наступствах учынення і ўтойвання злачынства; асобе злачынца; асобе суб'екта ўтойвання злачынства, які не з'яўляецца суб'ектам злачынства або яго асобнага эпізоду; асобе пацярпелага; матывах, намеры і мэтах учынення, утойвання злачынства і ўхілення злачынца ад крымінальнай адказнасці і пакарання; механізме злачынства; слядах злачынства і іх носьбітах; сувязі паміж элементамі злачынства. Аўтар адзначае, што гэты пералік не з'яўляецца закрытым [1, с. 248 – 249].

Вылучаць усе пералічаныя элементы пры пабудаванні крыміналістычнай характарыстыкі злачынства асобнага віду не заўсёды мэтазгодна. Для стварэння практыкаарыентаваных інфармацыйных мадэляў раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў сферы РПЗ неабходна вызначыць найбольш значныя рысы, уласцівыя для злачынстваў менавіта гэтага віду.

Прааналізаваўшы практыку Судовай калегіі Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь па справах інтэлектуальнай уласнасці аб разглядзе спрэчак, звязаных з невыкананнем абавязкаў па РПЗ [2] (следча-судовая практыка па крымінальных справах аб махлярствах, учыненых пад выглядам РПЗ, пакуль не напрацавана), а таксама шэраг дысертацыйных даследаванняў, у якіх апісваюцца крыміналістычныя характарыстыкі раскраданняў падобных відаў (працы Зямсковай А.М. [3], Дзяшука А.У. [4], Камянецкага Ю.Ф. [5], Шарова А.В. [6] і інш.), магчыма вылучыць асноўныя элементы крыміналістычных характарыстык раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, якія ўчыняюцца пад выглядам РПЗ:

1) суб'екты ўчынення злачынства і іх намеры;
2) абстаноўка ўчынення;
3) спосаб учынення і ўтойвання;
4) тыповыя сляды.

*Суб'екты ўчынення злачынства*

1. Службовыя асобы заказчыкаў і органаў, якія ўпаўнаважаны арганізоўваць і праводзіць дзяржаўныя закупкі ў сферы інфарматызацыі. Гэта асноўныя выканаўцы або нават арганізатары злачыннай дзейнасці.

Яны дзейнічаюць з прамым намерам – завалодаць грашовымі сродкамі органаў і арганізацый-заказчыкаў.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2. Супрацоўнікі арганізацыі-заказчыка (органа, які ўдзельнічае ў арганізацыі дзяржаўных закупак у сферы інфарматызацыі) – не службовыя асобы. Гэта могуць быць, напрыклад, уласныя ІТ-спецыялісты арганізацыі, юрысконсульты і інш. Намер прамы – з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці (павышэнне ў пасадзе, іншыя выгоды ад кіраўніцтва) садзейнічаць раскрадальнікам.

3. Кіраўнікі і супрацоўнікі юрыдычных асоб – распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння, а таксама іх магчымых субпадрадчыкаў.

Намер – наўмысна не выканаўшы дагаворныя абавязкі, завалодаць часткай грашовых сродкаў заказчыка па дамоўленасці з вышэй узгаданымі службовымі асобамі або атрымаць ад іх іншыя матэрыяльныя або нематэрыяльныя даброты і перавагі.

4. Спецыялісты ў сферы распрацоўкі праграмнага забеспячэння, якія прыцягваюцца ў якасці экспертаў. Гэтыя асобы ўцягваюцца ў злачынную дзейнасць не з мэтай ўчынення раскрадання, а для яго загадзя неабяцанага ўтойвання. Так, на стадыі судовага разбору грамадзянскай справы недобрасумленныя распрацоўшчыкі праграмнага забеспячэння могуць карыстацца паслугамі «незалежных» спецыялістаў у галіне ІТ. Гэты суб’ект факультатыўны. Паколькі службовыя асобы заказчыкаў – раскрадальнікі зацікаўлены ў адсутнасці выяўлення факту раскрадання і звароту ў праваахоўныя органы (нават у суд у парадку грамадзянскага судаводства). Аднак такія суб’екты могуць прысутнічаць, калі раскраданне ўчынена службовай асобай органа, які ўплывае на прыняцце рашэння па дзяржаўнай закупцы, або службовай асобай заказчыка, а ў суд звяртаецца прадстаўнік заказчыка, не ўцягнуты ў супрацьпраўную дзейнасць.

Намер «эксперта» – з карыслівай або іншай асабістай зацікаўленасці выказаць наўмысна ілжывае меркаванне (даць заключэнне) аб якаснасці выкананых прац.

*Абстаноўка ўчынення раскрадання* катэгорыі, якая разглядаецца, дэтэрмінавана вызначаным законам парадкам рэалізацыі праваадносін па РПЗ.

Для раскрадання шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ў адносінах да недзяржаўнай арганізацыі або індывідуальнага прадпрымальніка парадак ажыццяўлення праваадносін, пад выглядам якіх учыняецца раскраданне, вызначаецца грамадзянскім заканадаўствам. Найперш, артыкуламі Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь, якія рэгламентуюць парадак заключэння і рэалізацыі дагавору падраду і абавязальніцкія праваадносіны ўвогуле.

Для раскрадання шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, учыненага ў адносінах да дзяржаўнага органа або арганізацыі, рэалізацыя праваадносін па РПЗ рэгламентавана масівам заканадаўства аб дзяржаўных закупках у сферы РПЗ.

*Спосаб учынення і ўтойвання злачынства*

Парадак дзеянняў раскрадальнікаў у асноўным наступны:

падбор «патрэбнага» распрацоўшчыка праграмнага забеспячэння і дамоўленасць з ім. Пры гэтым могуць нават наўмысна ствараецца юрыдычныя асобы або рэгістравацца індывідуальныя прадпрымальнікі, якія потым выкарыстоўваюцца ў якасці падрадчыкаў і субпадрадчыкаў для вывядзення праз іх рахункі грашовых сродкаў;

правядзенне мерапрыемстваў па ўключэнні РПЗ для патрэб дзяржаўнага органа (арганізацыі) у праграму інфарматызацыі;

удзел арганізацыі-заказчыка ва ўсіх адмысловых этапах працэдуры дзяржаўнай закупкі або калі гаворка ідзе аб прыватным заказчыку – удзел у конкурснай працэдуры ці наўпрост прыцягненне неабходнага распрацоўшчыка;

заключэнне дагавора;

атрыманне распрацоўшчыкамі (магчыма, субпадрадчыкамі) грашовых сродкаў паводле ўмоў дагавора (усіх або часткі);

завалоданне грашовымі сродкамі службовымі асобамі – раскрадальнікамі і (або) іншымі асобамі, на карысць якіх дзейнічалі раскрадальнікі;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

бяздзеянне або недобрасумленнае выкананне абавязкаў распрацоўшчыкам (стварэнне замест якасных запатрабаваных заказчыкам камп'ютарных праграм кодаў, якія не працуюць або працуюць няякасна; прадстаўленне замест новага прадукту нізкаякасных праграм на аснове ўласных напрацовак заказчыка, або агульнаўжывальнага софту (напрыклад, замест стварэння унікальнай базы дадзеных распрацоўка на аснове MS Access) і інш.);

падпісанне акта прыёмкі выкананых прац або калі сама службовая асоба – раскрадальнік на гэта не ўпаўнаважана, то выкананне дзеянняў, накіраваных на прымус (шляхам падману, хабару, запалохвання і інш.) адпаведнай службовай асобы да падпісання;

пры адмове добрасумленнай службовай асобай заказчыка прыняць няякасную працу і звароце заказчыка ў праваахоўныя органы (у тым ліку грамадзянскі суд) – учыненне дзеянняў, накіраваных на ўтойванне злачынства.

*Тыповыя сляды*

Матэрыяльнымі (у тым ліку віртуальнымі) слядамі раскрадання шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, учыненанага пад выглядам РПЗ, з'яўляюцца:

дакументы – нарматыўныя прававыя і лакальныя акты; фінансава-гаспадарчая дакументацыя дзяржаўных органаў, дзяржаўных і недзяржаўных арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія з'яўляюцца заказчыкамі РПЗ, і іншых арганізацый і індывідуальных прадпрымальнікаў (недобрасумленных выканаўцаў, якія ўваходзяць з імі ў гаспадарча-прававыя адносіны, а таксама арганізацый, звязаных з распрацоўкай праграм інфарматызацыі і правядзеннем дзяржаўных закупак);

праграмныя коды, іншыя матэрыялы – прэзентацыі, адлюстраванні і інш., у тым ліку на матэрыяльных носьбітах (кампакт і жорсткіх дысках, флэш-картках і інш.);

электронная перапіска паміж прадстаўнікамі заказчыкаў і недобрасумленных выканаўцаў, паміж іншымі суб'ектамі злачынства (на аддаленых серверах ці матэрыяльных носьбітах).

Ідэальныя сляды раскрадання гэтага віду замацоўваюцца ў сведчаннях падазраваных (узгаданыя суб'екты), сведак (прадстаўнікі арганізацый-заказчыкаў, супрацоўнікі распрацоўшчыкаў, не ўцягнутыя ў злачынную дзейнасць), пацярпелых (заказчыкі – індывідуальныя прадпрымальнікі).

Важна адзначыць, што паміж усімі апісанымі элементамі існуюць прамыя ўзаемасувязі. Пры гэтым элементы ва ўзаемадзеянні маюць нераўназначнае становішча. Так, суб'екты ўчынення раскраданняў, спосаб і тыповыя сляды непасрэдна не ўплываюць на абстаноўку, вызначаную законным парадкам рэалізацыі праваадносін па РПЗ. Разам з тым гэты элемент шмат у чым дэтэрмінуе спосаб, сляды злачыннай дзейнасці і склад саўдзельнікаў раскраданняў.

Такім чынам, у структуры крыміналістычнай характарыстыкі раскраданняў шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі, учыненых пад выглядам РПЗ, магчыма вылучыць наступныя асноўныя ўзаемазвязаныя паміж сабой элементы: суб'екты ўчынення злачынства і іх намеры; абстаноўка, дэтэрмінаваная вызначаным законам парадкам рэалізацыі праваадносін па РПЗ; спосаб учынення і ўтойвання; тыповыя сляды. Падрабязнае іх апісанне дазволіць скласці ў правапрымяняльнікаў паўнавартаснае ўяўленне аб раскраданнях віду, які разглядаецца.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Ермолович, В. Ф. Криминалистическая характеристикиа преступлений / В. Ф. Ермолович. – Минск : Амалфея. – 2013. – 304 с.

2. Капіца, П. А. Аб выкарыстанні судовай практыкі па грамадзянскіх справах пры распрацоўцы крыміналістычнай методыкі расследавання раскраданняў у сферы

інфарматызацыі дзяржаўных органаў і арганізацый / П. А. Капіца // Права.by. – 2020. – № 3 (65). – С. 78–83;

3. Земскова, Е. Н. Расследование преступлений в сфере закупок товаров, работ, услуг для обеспечения государственных и муниципальных нужд : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.12 / Е. Н. Земскова ; Акад. управления М-ва внутр. дел Рос. Федерации. – М., 2018. – 32 с.;

4. Дешук, А. В. Криминалистическое обеспечение расследования хищений в сфере строительства : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.12 / А. В. Дешук ; Акад. МВД Респ. Беларусь. – Минск, 2016. – 24 с.;

5. Каменецкий, Ю. Ф. Методика первоначального этапа расследования хищений путем злоупотребления служебными полномочиями в бюджетной сфере : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.12 / Ю. Ф. Каменецкий ; Акад. МВД Респ. Беларусь. – Минск, 2016. – 25 с.;

6. Шаров, А. В. Методика расследования мошенничества в сфере оборота жилища : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.09 / А. В. Шаров ; Моск. ун-т МВД России. – М., 2004. – 30 с.

**УДК 343.985**

***В. В. Конин***
(*Северо-Западный филиал Российского государственного университета правосудия, Санкт-Петербург*)

***Е. В. Марьина***
(*Самарский национальный исследовательский университет имени академика С. П. Королева, Самара*)

## РАСКРЫТИЕ И РАССЛЕДОВАНИЕ ПРЕСТУПЛЕНИЯ, А ТАКЖЕ ВИДЫ ПРОТИВОДЕЙСТВИЯ РАССЛЕДОВАНИЮ (ТЕЗИСЫ)

*Раскрытие и расследование преступлений является одной из главных задач, возложенных обществом на правоохранительные органы. Вместе с тем, нередко эта деятельность происходит в условиях конфликта и противодействия расследованию. При этом противодействие может быть, как законным, так и незаконным. В статье авторы рассматривают вопросы раскрытия преступления, особенности их расследования, а также противодействия расследованию преступления и выделяют виды такого противодействия.*

Любое общество всегда заинтересовано в том, чтобы лицо, преступившее установленные правила поведения, понесло за это справедливое наказание. Но, в то же время, лицо, виновное в нарушении установленных обществом правил, часто стремится использовать всевозможные средства для того, чтобы избежать наказания полностью либо уменьшить последующее наказание. И одним из способов этого является противодействие раскрытию и расследованию преступления.

Прежде чем приступить к рассмотрению вопросов противодействия, считаем необходимым кратко рассмотреть, что следует понимать под раскрытием и расследованием преступления. Так, например, И.Ф. Герасимов под раскрытием преступления понимал установление события преступления, и лица, виновного в совершении преступления [1, с. 44]. Оценивая указанное высказывание, считаем необходимым отметить его краткость и емкость.

Развивая данное высказывание, А.В. Конин и С.А. Ялышев приходят к выводу о том, что раскрытие преступления происходит на разных этапах: как на стадии доследственной проверки информации о вероятном преступлении, так и на стадии предварительного расследования. Так, например, они указывают, что под раскрытием



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ